http://edoc.bseu.by

доступа : https://cyberleninka.ru/article/n/akt-batlera-i-ego-rol-v-stanovlenii-poslevoennoy-britanskoy-sistemy-obrazovaniya. – Дата доступа : 27.11.2022.

2 Ковлер, А. И. Антропология права : учебник / А. И. Ковлер. – М. : НОРМА – ИНФРА-М, 2002. – 480 с.

3 Конституция Германского рейха от 11 августа 1919 г. [Электронный ресурс]. – Режим доступа : https://www.1000dokumente.de/?c=dokument_de&dokument=00 02_wrv&l=ru&object=translation – Дата доступа : 27.11.2022.

4 Хрестоматия по всеобщей истории государства и права : в 2 т. / под ред. К. И. Батыра и Е. В. Поликарповой. – М. : Юристъ, 2007. – Т. 2. – 520 с.

***А.А. Бабкова***
БДЭУ (Мінск)

## ПОГЛЯДЫ АДАМА АЛІЗАРОЎСКАГА НА ПРАВЫ І СВАБОДЫ СЯЛЯН

У свядомасці беларускага грамадства з даўніх часоў сцвярджалася, што ўрады не даюць асноўныя правы, а закліканы абараняць свабоды і правы, якімі чалавек надзелены ад нараджэння, што законы павінны абараняць чалавека. Замацаванне грамадзянскіх правоў і свабод ўпершыню атрымалася толькі ў канцы XVIII ст., у перыяд буржуазных рэвалюцый у ЗША і Францыі, аднак нашы беларускія мысляры пачалі фарміраваць ідэі аб асабістых правах раней. Ужо ў сярэдзіне XVII ст. вядомы палітычны мысляр і правазнавец Вялікага Княства Літоўскага, уражэнец Віцебшчыны, прафесар кананічнага і цывільнага права юрыдычнага факультэта Віленскай езуіцкай акадэміі Аляксандр (Адам) Алізароўскі (1161—1659) пісаў: «Кіраўнікі не могуць укінуць сваіх падданых у няволю не толькі сілай, але і ўсталяваннем правоў. Гэтаму прынцыпова пярэчыць боскае права, натуральнае права і права народаў. Бо ніякія законы не могуць санкцыянаваць несправядлівасць» [2, с. 132]. Такім чынам, Алізароўскі адным з першых падняў праблему правоў і свабод сялян у сваёй галоўнай працы «Аб палітычнай супольнасці людзей». Нават у сучасным грамадстве ў некаторых краінах людзі да гэтага часу знаходзяцца ў няволі. На беларускіх землях прыгоннае права было адменена толькі ў 1861 годзе, тады як тэарэтычнае абгрунтаванне ідэі вызвалення сялян з’явілася яшчэ ў XVII ст., — Адамам Алізароўскім, які адны з першых сфармуліраваў гэтую думку.

Асаблівасцю работы Алізароўскага з’яўляецца багатае цытаванне, спасылкі на шматлікія працы сваіх папярэднікаў, у выніку чаго не заўсёды ясна бачная пазіцыя самога аўтара. Гэтая акалічнасць прыводзіць да меркавання аб неарыгінальнасці дадзенага твора, аднак пасля аналізу яго работы становіцца зразумела, што гэта асабістая стылістыка напісання: ён вызначаў разнастайныя меркаванні другіх аўтараў, а сваю пазіцыю выказваў праз моцную аргументацыю. Узорам для сваёй работы Алізароўскі ўзяў антычны трактат Арыстоцеля «Палітыка».

Адной з найбольш вострых праблем у працы можна назваць адносіны спадара і раба. Гэтаму прысвечана 11 глава кнігі «Дом». Алізароўскі задаецца пытаннем: ці з’яўляюцца прыгонныя сяляне нявольнікамі, ці ўсё ж-такі вольнымі людзьмі? – і больш схіляецца да высновы, што сяляне – гэта вольныя людзі. Ён разглядаў гэтую пазіцыю з боку права: сяляне зусім не з’яўляліся нявольнікамі, а толькі вольнымі ад нараджэння грамадзянамі, бо прававых асноў іх няволі нельга абгрунтаваць ні з дапамогай права народаў, ні дзяржаўнымі актамі. Не сталі яны імі ў выніку палону ці з-за нараджэння ад рабыняў ці палонніц. Добраахвотна яны таксама не прадалі сябе па здзелках самазакладу і не патрапілі ў няволю ні па адной з прычын, названых вышэй. На яго думку, адносіны паміж феадаламі і сялянамі павінны былі складвацца на аснове дамовы са сваімі панамі, а менавіта паны здавалі ў арэнду палі пэўных памераў за адпаведную плату, а сяляне са свайго боку выплачвалі пэўныя сумы і выконвалі панам пэўныя работы па апрацоўцы зямлі, а таксама мелі права пераходу на новае месца жыхарства [1, с. 76].

Пры гэтым Алізароўскі разумеў, што насамрэч усё адбываецца зусім не так. Калі звярнуць увагу на тое, што ў рэальнасці церпяць ад многіх паноў гэтыя няшчасныя людзі, можна зразумець, што знаходзяцца яны ў жахлівай няволі: прысвоілі ў адносінах да іх права на жыццё і смерць не толькі паны-ўласнікі апрацоўваемых імі зямель, а кожны шляхціц як хоча, так і замахваецца на іх жыццё. Пра гэта вядома нават чужым аўтарам. «Тыя, – кажа Бадэн, – каго палякі кметамі завуць, змушаныя выносіць жудасныя рэчы. Шмат хто можа пазбавіць іх жыцця, і за гэта вінаватым пагражае толькі лёгкае пакаранне ў выглядзе дзесяці злотых штрафу. Іх жа ўласныя паны могуць увогуле рабіць гэта бяскарна» [2, с. 133]. Алізароўскі пісаў аб нечалавечых адносінах да сялян, ён лічыў, што іх жыццё ніяк не хвалявала паноў, што ўвогуле парушала усе іх правы і свабоды: «Калі б іх забівалі толькі свае паны, а не ўсякія. Гэтыя людзі няшчасней прыналежных панам сабак! Бо за забойства аднаго сабакі яны плацілі многімі чалавечымі галовамі. Можна было б прывесці мноства прыкладаў такога кшталту. І ніхто ў сваёй айчыне не з’яўляецца такім чужым, каб гэтага не ведаў, і трэба быць вялікім ворагам праўды, каб гэта адмаўляць» [2, с. 134].

Ужо ў канцы 11 главы сачынення Алізароўскага з’яўляецца разуменне таго, што не так адназначна ён выказвае сваю пазіцыю датычна свабоды сялян. Хоць і сяляне не адпраўляліся ў няволю па праве і справядлівасці, правы іх былі моцна абмежаваны і залежалі яны ад паноў. Пачатак афармлення прыгоннага права паклаў прывілей Казіміра Ягайлавіча 1447 г. У ім вялікі князь загадаў феадалам не прымаць у сваіх уладаннях сялян, якія ўцяклі з дзяржаўных маёнткаў. Таксама феадалы атрымалі права вотчыннага суда над сялянамі. Памешчыкі маглі перадаваць ойчычаў (асабіста залежных сялян) у спадчыну, дарыць, закладваць і прадаваць з зямлёй і без зямлі. К канцу XVI ст. (па Статуце 1588 г.) у Вялікім Княстве Літоўскім канчаткова аформілася прыгоннае права. Сялян можна было прадаваць, абменьваць, аддаваць у заклад. Амбасадар Свяшчэннай Рымскай імперыі Жыгімонт Герберштэйн, праязджаючы праз тэрыторыю Вялікага Княства Літоўскага ў Маскоўскую дзяржаву, адзначаў: «Народ... прыгнечаны цяжкім рабствам. Таму што любы, хто апрануты ўладай,

можа зайсці ў жыллё селяніна і... без страху пакарання зрабіць усё, што пажадае... нават жорстка збіць селяніна» [2, с. 137].

Такім чынам, можна падвесці вынік: А. Алізароўскі напрамую не прапаноўваў адмену прыгоннага права, але пры гэтым разглядаў некаторыя выпадкі, у якіх можна лічыць сялян свабоднымі грамадзянамі. Адмоўна ставячыся да сістэмы прыгонніцтва, якая панавала ў тагачасным Вялікім Княстве Літоўскім, ён прытрымліваўся думкі, што сяляне знаходзіліся ў няволі і іх адносіны з панамі не павінны былі быць залежнымі і беспакаранымі. Сам Алізароўскі, як і прагрэсіўныя мысляры таго часу разумеў, што становішча сялян крытычнае і гэта трэба мяняць. Ужо ў XVI—XVII ст. палітыка дзяржавы была накіравана на ўдасканаленне судаводства датычна парушэння правоў грамадзян і справядлівасці заканадаўчых актаў.

Усё вышэйадзначанае дазваляе сцвярджаць, што ідэі грамадзянскіх правоў чалавека маюць на Беларусі глыбокую гісторыю і багатыя традыцыі, закладзеныя ў самой псіхалогіі, спосабе паводзін, нацыянальным характары беларусаў. Меркаванні Алізароўскага нашмат апярэдзілі афармленне ідэй аб праве на свабоду многіх заходнееўрапейскіх прагрэсіўных мысліцеляў. І цяпер абарона асабістых правоў і свабод чалавека з’яўляецца адным з фундаментальных прынцыпаў, як на міжнародным, так і на нацыянальным узроўні.

Спіс выкарыстанай літаратуры

1 Вішнеўская, І. У. Гісторыя палітычнай і прававой думкі Беларусі : дапамож. для студэнтаў вышэйшых навуч. устаноў / І. У. Вішнеўская. – Мінск: Тэсей, 2004. – 272 с.

2 Олизаровский, А. А. О политической общности людей / А. А. Олизаровский ; пер. с лат. Л. П. Ляхова // Памятники философской мысли Белоруссии XVII – первой половины XVIII в. / В. В. Дубровский [и др.] ; сост. С. А. Подокшин ; редкол.: А. С. Майхрович, С. А. Подокшин, Д. И. Широканов. – Минск : Навука і тэхніка, 1991. – С. 131–143.

***А.С. Васько***
БГЭУ (Минск)

## РОЛЬ «ЗАПИСОК ФЕДЕРАЛИСТА» В РАТИФИКАЦИИ КОНСТИТУЦИИ США

В 1783 г. закончилась североамериканская война за независимость: после 8-ми долгих и тяжелых лет американцы добились независимости от Великобритании и смогли приступить к строительству абсолютно нового государства. Однако это оказалось непростым делом. Первая писаная конституция страны, «Статьи Конфедерации», принятая в июле 1776 г., создала федеральное правительство, которое имело небольшую власть над отдельными штатами и не имело возможности взимать налоги или регулировать торговлю, не имелось и